# У РОДНЫМ МІНСКУ БУДЗЕ ЎЗОРНЫ ПАРАДАК!

**Студэнты геафака адгукнуліся на заклік юрыстаў.**

★

„Парадак забяспечым", — гаворыць У. Галайша, студэнт філфака.

★

„Хуліганаў не пацерпім", — заявілі дружыннікі.

## ГЭТА НАША СПРАВА!

*ПРЫГОЖЫ НАШ РОДНЫ Мінск! Яго паднялі з руін нашы бацькі, старэйшыя браты і сёстры. А сёння, на радасць, і нам яшчэ даводзіцца класці цагліну за цаглінай, каб рос і яшчэ больш прыгажэў наш цудоўны горад. Хто не захапляецца яго шырокім, велічным праспектам, казачнымі палацамі, паркамі і скверамі!*

*Але вось уявіце сабе, што на вуліцах дарагога вашаму сэрцу горада вы сустрэлі п'яніцу з абвіслай губой, які прыстае без усякай прычыны да праходзячых, лаецца, а то і нож з кішэні выцягне і пачне пагражаць. Паводзіны хулігана ўсіх абураюць...*

*А так было яшчэ зусім нядаўна. І вельмі добра, што ў горадзе былі створаны камсамольскія штабы. Яны многа зрабілі ў справе барацьбы з антыграмадскімі праявамі, п'янствам і хуліганствам. Значна менш ужо стала на вуліцы п'яных і хуліганаў. Аднак іх можна ўсё ж сустрэць яшчэ і сёння, і не ў адным толькі Мінску. Вось чаму ўзрадавала кожнага сумленнага савецкага чалавека паведамленне аб прыняцці ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР спецыяльнай пастановы аб удзеле працоўных у ахове грамадскага парадку.*

*Поспех гэтай важнай і патрэбнай справы залежыць цяпер ад нас саміх. Раней нам, студэнтам філфака, цяжка і нязручна было спалучаць заняткі ва універсітэце і патруляванне. Займаліся мы ў другую змену, а патруляваць прыходзілася ў асноўным увечары. І атрымлівалася ў нас амаль заўсёды так, што камсамольскі патруль—гэта наспех арганізаваная зборная каманда з камсамольцаў ад кожнага курса па некалькі чалавек. А цяпер, калі мы створым універсітэцкую дружыну, усё будзе зусім па-другому. Акрамя гэтага, чым больш у дружыну ўключыцца студэнтаў, тым большы будзе наш поспех.*

*Многія студэнты юрыдычнага факультэта ўжо падалі заявы ў камітэт камсамола з просьбай залічыць іх ва універсітэцкую дружыну. Яны звярнуліся з заклікам да ўсіх студэнтаў універсітэта. На днях камсамольскае бюро аддзялення рускай мовы і літаратуры разглядзела пытанне аб удзеле ў стварэнні універсітэцкай дружыны. Гэтае пытанне рашылі вынесці на абмеркаванне на чарговым камсамольскім сходзе аддзялення, якое хутка павінна адбыцца. Зараз вядзецца шырокая растлумачальная работа на курсах нашага аддзялення. Адзін за адным паступаюць заявы аб прыёме ў дружыну.*

*Мы не сумняваемся, што камсамольцы нашага аддзялення горача адгукнуцца на заклік студэнтаў-юрыстаў, паследуюць іх прыкладу.*

*Уладзімір ГАЛАЙША,*
*намеснік сакратара камсамольскага бюро аддзялення рускай мовы і літаратуры.*


*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

**Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна**

| № 15 (360) | Субота, 11 красавіка 1959 года | Цана 20 кап. |
|---|---|---|


## Лічу сваім абавязкам

Партыя і урад паставілі перад грамадскімі арганізацыямі вялікую задачу па ахове грамадскага парадку. Мы, як камсамольцы, не павінны быць ад гэтай справы ў баку.

Мне ў якасці камсамольскага патруля прыходзілася прымаць удзел у барацьбе з парушальнікамі грамадскага парадку. У гэтым напрамку камсамольскі патруль зрабіў шмат чаго.

Усё менш і менш здараецца выпадкаў антыграмадскіх учынкаў. Але яны яшчэ ёсць— і для гэтага трэба заклікаць да парадку тых, хто перашкаджае савецкім людзям спакойна працаваць і адпачываць.

І гэта зробіць народная дружына.

Таму я падтрымліваю заклік студэнтаў-юрыстаў II курса. Удзел у дружыне лічу сваім грамадскім і камсамольскім абавязкам.

П. ІВАНЧЫК,
студэнт III курса беларускага аддзялення.

## МЫ ўступілі Ў ДРУЖЫНУ

*З ВЯЛІКІМ АДАБРЭННЕМ сустрэлі савецкія людзі пастанову ЦК партыі і Савета Міністраў СССР аб удзеле насельніцтва ў ахове грамадскага парадку. З радасцю сустрэлі яго і студэнты нашага курса. Нам, як і ўсяму савецкаму народу, хочацца, каб наша Радзіма стала яшчэ прыгажэйшай і багацейшай. Гэтага можна дасягнуць настойлівай барацьбой з парушэннямі сацыялістычнай маралі.*

*Прачытаўшы ў газеце «Беларускі універсітэт» зварот студэнтаў юрыдычнага факультэта да ўсіх студэнтаў нашага універсітэта з прапановай актыўна ўключыцца ў работу па ахове грамадскага парадку, мы падтрымалі гэты заклік і ўступаем у дабравольную дружыну. Мы таксама заклікаем студэнтаў нашага універсітэта прыняць актыўны ўдзел у гэтай агульнанароднай справе.*

*Няхай жа не будзе ў нашым грамадстве месца парушальнікам грамадскага парадку.*

*І. ІВАНОВА,*
*Р. МАТУСЕВІЧ,*
*Г. НАРЭВІЧ,*
*А. ПАНКРАТАВА,*
*студэнты III курса геаграфічнага факультэта.*

**МЫ не пацерпім, каб у нашым грамадстве былі тыя, хто не хоча прытрымлівацца нашых сацыялістычных парадкаў і законаў! Прышоў час патрабаваць ад усіх такіх: кіньце свае дурныя звычкі, станавіцеся ў агульную калону будаўнікоў камунізма.**

**Гэтыя словы гавораць камсамольцы універсітэта-дружыннікі.**

**НА ЗДЫМКУ: група студэнтаў-дружыннікаў**




## КАМУНІСТЫ БУДУЦЬ УПЕРАДЗЕ

З ПЕРШЫХ ДЗЕН вучобы ва універсітэце на нашым I курсе юрыдычнага факультэта была створана брыгада садзейнічання міліцыі. За ўвесь перыяд яе існавання праведзена вялікая работа па барацьбе з хуліганствам, спекуляцыяй, па забеспячэнню грамадскага парадку пры правядзенні масавых мерапрыемстваў у Палацы прафсаюзаў. Брыгада актыўна дапамагла універсітэцкаму камсамольскаму штабу. У яе рабоце прынялі ўдзел студэнты-камуністы нашага курса.

З вялікай радасцю я ўспрыняў пастанову ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб стварэнні народных дружын. Справядліва ў ім сказана, што калі само грамадства возьме ў свае рукі справу аховы парадку, то парушальнікам не знойдзецца месца ў нашым асяроддзі.

У мінулым нумары шматтыражкі быў змешчан зварот чатырох камсамольцаў з заклікам уступаць у дружыну. Я ўпэўнены, што студэнты-камуністы нашага універсітэта і выкладчыкі таксама не застануцца ў баку ад гэтай справы. Наш абавязак—прыняць актыўны ўдзел у стварэнні і рабоце народных дружын.

Барацьбу з парушальнікамі грамадскага парадку я заўсёды лічыў сваёй кроўнай справай і іменна таму уступіў на днях у дружыну.

**Л. КЕНДА, член КПСС.**



★

**На здымку: лабарант к лабараторыі заалогіі бесхрыбетных Р. Кавалеўская вядзе назіранні за станам рыб у акварыуме.**

**Фота Г. Праваловіча.**

★

## Нарада актыву і выкладчыкаў

*Днямі ў клубе БДУ адбылася нарада камсамольскага актыву і выкладчыкаў, замацаваных за курсамі. Перад сабраўшыміся выступіў сакратар Ленінскага раённага камітэта КПБ тав. Іскра. Ён азнаёміў прысутных з палажэннем аб народных дружынах, расказаў аб вопыце работы ўжо створанай народнай дружыны медыцынскага інстытута, аб задачах камсамольскага актыву і выкладчыкаў па арганізацыі гэтай важнай справы. На нарадзе было вырашана ў бліжэйшы час закончыць стварэнне універсітэцкай дружыны.*

## Сустрэча з сатырыкамі

Днямі кафедра партыйна-савецкага друку арганізавала сустрэчу студэнтаў-журналістаў з майстрамі сатырычнага слова. Рэдактар часопіса «Вожык» Павел Кавалёў пазнаёміў студэнтаў з сатырыкамі. З чытаннем сваіх твораў выступілі Міхась Пянкрат, Лявон Прокша, Мікола Гроднеў, паэт Максім Лужанін, байкапісец Уладзімір Корбан.

Цёпла было сустрэта выступленне аднаго са старэйшых фельетаністаў часопіса «Кракадзіл» Я. Вясеніна. Ён расказаў аб сваёй рабоце, аб форме і метадах пошукаў тэм для сваіх фельетонаў, адказаў на шматлікія пытанні студэнтаў.

Ад імя прысутных загадчык кафедры М. С. Зярніцкі горача дзякаваў работнікаў друку.

Гэтая творчая сустрэча прынесла многа карыснага студэнтам, дапаможа ім у набыцці сатырычнага майстэрства.

# ЗА ЛЕПШУЮ ГРУПУ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ!

## Імя Пічэты, першага рэктара БДУ



*У кожнага студэнта ёсць такія справы, якім ён аддаецца ўвесь. Вось і Фелікс Налівайка знайшоў сабе справу па сэрцу. Ён з захапленнем працуе ў навуковых гуртках гістфака. Зараз пад кіраўніцтвам прафесара Н. П. Палетыкі ён піша работу «Барацьба імперыялістычных дзяржаў у перыяд першага мараканскага крызісу». Фелікс прымае ўдзел у юбілейных навуковых канферэнцыях. Да канферэнцыі, прысвечанай 89 гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, ён рыхтуе пад кіраўніцтвам дацэнта В. К. Дашкевіча даклад «З гісторыі мараканскага народа». Шмат часу ўдзяляе Налівайка і грамадскай працы. Ён—намеснік старшыні Савета СНТ гістфака, удзельнічае ў выпуску «Бюлетэня СНТ», насценнай газеты «Студент гістфака». У мінулым годзе ўсе бачылі яго ў выкананні сцэны з п'есы Маякоўскага «Лазня».*

*За выдатныя поспехі ў вучобе, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці факультэта і вялікую працу ў навуковым таварыстве яму была назначана стыпендыя імя Пічэты.*

*Фелікс Налівайка пачуў аб тым, што на філфаку ўзнікла барацьба за званне лепшай групы на факультэце і вырашыў прапанаваць гэта на камсамольскім сходзе. Можна верыць, што чацвёрты курс гістфака, дзе вучыцца Фелікс, падхопіць прапанову свайго лепшага аднакурсніка.*

## ПАЧЫН ПАДТРЫМАЦЬ!

**По ўсей краіне разгарнулася барацьба працоўных за права называцца людзьмі камуністычнай працы. Нашы студэнты таксама жадаюць крочыць у нагу з жыццём. У многіх у гэтыя дні ўзнікла думка аб групе, курсе, факультэце камуністычнай вучобы. Некаторыя засупярэчылі. Мы студэнты, мы не ствараем матэрыяльных вартасцей, ці не за высокая будзе для нас гэта назва. І вось нядаўна зарадзіўся новы рух: за права называцца групай, лепшай на факультэце.**

**На нашу думку, гэты пачын павінен прывесці ў рух усе вучэбныя групы універсітэта. На камсамольскіх сходах трэба ўзважыць усе магчымасці сваіх груп і адгукнуцца на яго пасапраўднаму. са студэнцкім запалам.**

## Ён чацвёрты год выдатнік



*Яўген Самускевіч, як і гаварылі пра яго аднакурснікі, сапраўды аказаўся здольным юнаком. Яго фатаграфія ёсць на стэндзе, дзе змешчаны імёны выдатнікаў вучобы універсітэта.*

*Зараз ён—член камсамольскага бюро хімфака, адказны за акадэмічны сектар і за навукова-даследчую работу на факультэце, староста групы неарганікаў. На факультэцкім стэндзе паявіўся першы іх лісток-маланка, вядзецца графік наведвання студэнтамі лекцый. Да навуковай канферэнцыі, прысвечанай 89 гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, рыхтуецца 6 работ.*

*Яўген удзельнічаў ва Усесаюзным перапісу насельніцтва 1959 года. З-за гэтага яму прышлося толькі ў сярэдзіне сакавіка здаваць экзамен па будове малекулы. Як і астатнія экзамены, гэты ён таксама вытрымаў на выдатна.*

*А ўвогуле ад яго, як ад сталінскага стыпендыята, трэба патрабаваць больш, чым ад іншых студэнтаў. Вось, напрыклад, ён любіць гуляць у баскетбол, нават залічаны ў факультэцкую каманду. Час ад часу ён выступае ў канцэртах самадзейнасці з мастацкім чытаннем, але таксама рэдка. Раней ён сам пісаў навуковыя даклады ў гуртках, а цяпер гаворыць, што няма часу.*

*Безумоўна, Яўген працалюбівы, усебакова развіты. Аднак яго званне выдатніка патрабуе не толькі выдатных поспехаў у авалоданні ведамі, але і самага актыўнага ўдзелу ва ўсіх баках студэнцкага жыцця.*

## ГАВОРЫЦЬ Людміла БЯСПАЛАВА

**(І курс геафака)**

**Нядаўна мы, 6 студэнтаў першага курса, выязджалі ў раён возера Нарач. Прамервалі глыбіню і вычэрчвалі карту азёр Баторына і Мястра. І адным з лепшых уражанняў было тое, як неабходна нам, будучым географам, пачуццё калектывізма, таварыская ўзаемная падтрымка і гатоўнасць дапамагчы адзін аднаму. Без гэтага немагчыма выканаць тыя задачы, якія будуць стаяць перад любымі экспедыцыямі.**

## КОРПУС „Б“, 16

Гэты пакой, дарэчы кажучы, складаецца з двух невялікіх пакойчыкаў, у кожным з іх жыве па 5 дзяўчат. Тут жывуць першакурсніцы. Толькі адна з іх—Валя Хадаровіч вучыцца на другім курсе.

Гэта дружны калектыў. Вось і зараз увесь пакой гуртам рашае задачы, але гэта не перашкаджае фізікам спрачацца з матэматыкамі, што іх Турэцкі чытае лепш за Родава.

Аднак і адпачынак таксама трэба правесці карысна. І вось—кіно, тэатр, цырк. Хаця дзяўчаты часцей ходзяць у кіно ці тэатр усёй групай, але 16 пакой займае месца толькі разам, цясней адзін да аднаго. Доўга абмяркоўваюць яны бачанае. Соня Рыбалка і Ала Лапуцька спрачаюцца аб кінафільме «Чалавек з планеты Зямля». Нічога, што сяброўкі, а свой погляд трэба адстайваць. А цяпер на чарзе культпаход на гастролі Карандаша.

Міра Заленская калісьці была добрай спартсменкай. Яна атрымала другі разрад па лыжнаму спорту, калі яшчэ вучылася ў 9 класе на Маладзечыншчыне. А цяпер яна ніяк не можа паўтарыць свайго выніку. Што ж, трэба яшчэ больш трэніравацца, думае Міра, каб дасягнуць свайго.

Гэта ж самая Міра, разам з Соняй, вырашыла вывучаць мову эсперанта.

Час ад часу Соня бывае ў гасцях у рабочых аўтазавода, дзе дапамагае студэнтам-завочнікам вышэйшых і сярэдніх устаноў рыхтавацца да экзаменаў. Нездарма сяброўкі гавораць, што яна больш за ўсіх у пакоі любіць матэматыку.

Іра Анасовіч ужо дагаварваецца з вучнямі 4-га класа 42 школы горада Мінска, каб яны пабывалі ў іх на фізфаку на экскурсіі. Яна ж там піянерважатая.

І няхай не ўсё яшчэ ўдаецца, няхай перад стыпендыяй прыходзіцца жыць камунай, але кожная з дзесяці можа сказаць толькі адно аб сваім пакоі:

— У нас заўсёды весела. Гэта ж залежыць толькі ад нас саміх.

## ГАВОРЫЦЬ Іван ШАЎЧЭНКА

**(ІІ курс юрфака)**

**За апошні час на нашым факультэце значна пагоршылася палітыка-выхаваўчая работа са студэнтамі. А студэнты юрфака, будучыя супрацоўнікі суда і пракуратуры, павінны самі быць як мага лепшымі ў маральных адносінах.**

**Таму я лічу, што вельмі добра было б, каб усе групы юрфака падхапілі вельмі карыснае пачынанне: барацьбу за групу, лепшую на факультэце.**

## УСЕ АКТЫЎНЫЯ



*У ГРУПЕ ЗАОЛАГАЎ III курса біяфака 29 чалавек. Але калі спатрэбілася вызначыць актыў групы, гэта аказалася нялёгка зрабіць.*

*Вось, напрыклад, усе студэнты групы працуюць у 4 навуковых гуртках, якія арганізаваны на біялагічным факультэце па заалагічных дысцыплінах. Гуртк оўцы, дзякуючы сваёй навукова-даследчай працы, значна лепш будуць рыхтаваць курсавыя і дыпломныя работы.*

*Вельмі добра працуе гурток гідрабіялогіі, якім кіруе прафесар Г. Г. Вінберг. Актыўна ўдзельнічаюць у ім Шушкіна, Печэнь, Астапеня. Камсорг Галіна Душкевіч—староста гуртка фізіялогіі чалавека і жывёл. На факультэце ўсе ведаюць Леаніда Шклярова — старасту гуртка заалогіі хрыбетных і старшыню Савета СНТ біяфака.*

*У групе ёсць нямала добрых спартсменаў. Эла Шушкіна і Яўген Юрачка займаюцца ў гімнастычнай секцыі. Уладзімір Бародзіч—выдатны акрабат.*

*Нягледзячы на тое, што ва універсітэце валейбалісты і баскетбалісты біяфака не карыстаюцца славай, трэцякурснікі ўсё ж зарэкамендавалі сябе з добрага боку. Эла Кнацько з'яўляецца капітанам факультэцкай баскетбольнай каманды. Член факультэцкага бюро камсамола, адказная за спартыўна-масавую работу Галіна Нікіціна ўваходзіць у зборную універсітэцкую валейбольную каманду.*

*Нядрэнна гуляе ў валейбол і баскетбол Ніна Кручкова.*

*Справы з мастацкай самадзейнасцю прыкладна такія ж, як і са спортам. Цэлая група трэцякурснікаў спявае ў факультэцкім хоры. Гэта Тамара Курзава, Зоя Сідарэнка і іншыя. Некалькі чалавек уваходзіць у танцавальны калектыў. Лераіда Налівайка — дамрыстка. Галя Душкевіч—дэкламатар, удзельнічае ў драмгуртку.*

*Трэба пагаварыць яшчэ вось аб чым. Камсорг Галіна Душкевіч, калі даведалася, што ва універсітэце пачаўся шырокі рух за званне групы, лепшай на факультэце, то адразу сказала, што іх група заолагаў III курса падтрымае гэты пачын.*

*Спаборніцтва за званне групы, лепшай на факультэце, дапаможа падняць, палепшыць шматбаковае жыццё факультэта.*

*Тады не толькі усе 29 студэнтаў трэцяга курса біяфака, але і ўвесь шматлікі калектыў біялагічнага факультэта будзе сапраўды актыўным.*

**Старонку падрыхтаваў Я. Ляхаў.**

Фота Г. Праваловіча.

# ПАЧЫНАЮЧЫ ПАЭТ-КАМПАЗІТАР

☆ ☆

*Уладзіміра Карызну ведалі мы дасюль як маладога паэта. Вершы яго не раз друкаваліся на старонках газеты «Беларускі універсітэт». А тыя, хто жыве разам з ім у студэнцкім інтэрнаце, знаюць яшчэ, што Валодзя любіць і разумее музыку. Ён складае песні на свае і «чужыя» словы.*

*Ніжэй мы знаёмім чытачоў з новай песняй Уладзіміра Карызны на словы Кастуся Кірэенкі.*



☆

## Люблю тваё неба

сл. Кастуся Кірэенкі
муз. Уладзіміра Карызны




*Люблю тыя сцежкі на родным Палессі,*
*Дзе бегала ты па расе басанож.*
*І, можа, таму ты мне снішся на ўзлессі*
*Бярозкай у краі, дзе коціцца Сож.*

*Люблю твае песні без слоў, у растанні*
*Мне сэрца твайго парыванне чутно.*
*Люблю нават тое, што любым не стане,*
*За тое люблю, што з табою яно.*

*І ў час, калі сіл маіх болей не хопіць*
*Ад цэлага свету смутак хаваць,—*
*Ты скажаш: Нічога, звычайны быў хлопец,*
*Адно толькі—сэрцам не ўмеў кіраваць.*

## СЯБРОЎСКІЯ СУСТРЭЧЫ

Таварысцкая сустрэча валейбалістаў Вільнюскага і нашага універсітэтаў выклікала вялікую цікавасць аматараў спорту. У папярэдніх сустрэчах наша мужчынская каманда перамагла, жанчыны пацярпелі паражэнне. На другі дзень каманды сустрэліся зноў. Вострая, напружанная гульня мужчынскіх каманд прынесла перамогу гасцям з лікам 3:2. Перамаглі таксама і літоўскія валейбалісткі.

З сяброўскім візітам у Вільнюс выязджалі нашы плаўцы. Яны выйгралі матчавую сустрэчу. Каманда ўзнагароджана граматамі за агульнае першае месца і за перамогу на эстафетах.

**Г. ФАМІН.**

*ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ*

# КАМУ ПАТРЭБНА ТАКАЯ КРЫТЫКА?

У газеце «Беларускі універсітэт» ад 4 красавіка 1959 г. пад рубрыкай «Нам пішуць» быў змешчаны артыкул «Танцаваць трэба вучыцца». Аўтар артыкула—студэнт III курса юрыдычнага факультэта А. Лебедзеў, які раней быў членам універсітэцкага танцавальнага калектыву і ў лістападзе 1958 г. за непавагу да калектыву і недысцыплінаванасць быў выключаны з ліку яго членаў. Зараз ён піша ў сваім артыкуле, што «належыць рашучым чынам рэарганізаваць работу танцавальнага калектыву» і спрабуе даць кірунак гэтай рэарганізацыі.

З некаторымі заўвагамі Лебедзева нельга не згадзіцца. Так, правільным, хоць і не новым, з'яўляецца сцвярджэнне аб тым, што «залогам поспеху з'яўляецца праца, яшчэ раз праца». Удзельнікі універсітэцкага танцавальнага калектыву добра ведаюць гэтую ісціну, і паспяховыя выступленні нашага калектыву за апошні час сведчаць аб тым, што ўдзельнікі правільна яе разумеюць.

Правільнай з'яўляецца заўвага і аб акампанеменце. Мы думаем, што праўленне клуба ў далейшай рабоце ўсё гэта ўлічыць.

А. Лебедзеў лічыць, што галоўнай задачай танцавальнага гуртка з'яўляецца выхаванне танцораў-салістаў. Гэта зусім няверна. Поспех любога гуртка самадзейнасці, у тым ліку і танцавальнага, залежыць не ад асобных салістаў (добра, зразумела, калі яны ёсць), **а ад работы ўсяго калектыву.** Парада пабудаваць работу так, каб пры выкананні танца ўперадзе сцэны было некалькі салістаў, а ў глыбіні ўся астатняя «безаблічная маса», не можа быць пакладзена ў аснову работы нашага калектыву.

Другі недахоп у рабоце танцавальнага гуртка аўтар артыкула бачыць у тым, што, на яго думку, кіраўнік Л. К. Алексютовіч—чалавек без вопыта, недастаткова кваліфікаваны, якога патрэбна неадкладна вызваліць ад работы. Нас, удзельнікаў танцавальнага калектыву, такое сцвярджэнне не можа не абурыць. За апошнія тры гады ні на адным аглядзе мастацкай самадзейнасці ніхто з членаў журы ніколі **не рабіў у наш адрас заўваг, якія б маглі паставіць пад сумненне кваліфікацыю нашага кіраўніка.**

У сваім артыкуле А. Лебедзеў піша, што прысутнічаючы летам мінулага года на студэнцкім свяце песні і танца ў Рызе, дзе выступаў наш танцавальны калектыў, ён, маўляў, дрэнна сябе адчуваў, калі спрабаваў параўнаць выступленні нашых танцораў з выступленнямі украінскіх студэнтаў. Мы не ведаем, чаму Лебедзеў так дрэнна сябе адчуваў. Мы ж усе шчыра радаваліся поспехам нашых украінскіх сяброў. Радаваліся таксама і таму, што ў органе ЦК ЛКСМ Латвіі—газеце «Советская молодёжь» (№ 133 (3322) ад 8 ліпеня 1958 г.—у артыкуле, прысвечаным выступленням першага дня свята, давалася высокая ацэнка тэхнікі выканання танцаў калектыву Белдзяржуніверсітэта.

Мы лічым, што рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт», перад тым, як прадаставіць свае старонкі для артыкула А. Лебедзева, павінна была пацікавіцца прычынамі выключэння Лебедзева з ліку членаў танцавальнага калектыву універсітэта. Паколькі рэдакцыя гэтага не зрабіла, мы лічым сваім абавязкам сказаць аб гэтым.

А. Лебедзеў паступіў у танцавальны гурток у верасні 1956 г. Аднак за два гады ўдзелу ў рабоце калектыву ніхто не вызначаўся такой недысцыплінаванасцю, як Лебедзеў. Ён пастаянна прапускаў рэпетыцыі, а калі і з'яўляўся на іх, то спрачаўся з кіраўніком, адмаўляўся ад трэнажа, ад рэпетыцый нізавых рухаў, пратэставаў супраць беларускіх танцаў, часта не з'яўляўся на выступленні. У час паездкі ў Рыгу летам мінулага года Лебедзеў у дзень выступлення без дазволу кіраўніка паехаў на Рыжскае узмор'е, у выніку танцавальная група выступала без яго.

Лебедзеў з яго тэорыяй «салістаў» (а ён лічыў сябе салістам), відавочна думаў, што без яго наш калектыў развaліцца і таму ўсё яму будзе сходзіць з рук. Аднак калектыў рашыў інакш: у верасні 1958 г. Лебедзеў быў выключаны з нашага гуртка.

Мы не ведаем, якія намеры былі ў Лебедзева, калі ён пісаў свой артыкул. Але мы не думаем, што ён кіраваўся шчырым пачуццём даць добрую параду і тым самым палепшыць работу нашага калектыву. Ад барацьбы за поспех калектыву Лебедзеў быў заўсёды далёкі.

**В. ПОСТНІКАВА,**
**А. КРАМНІК,**
**А. БІРУКОЎ,**
**Р. СТАНКЕВІЧ,**
**удзельнікі танцавальнага калектыву універсітэта.**

## Фізкультура і спорт

# ШАХМАТНЫЯ НАВІНЫ

**—ЯКІ ГЭТА па ліку чэмпіянат?, — звярнуўся нехта з удзельнікаў асабістага першынства універсітэта па шахматах да галоўнага суддзі. Аднак ніхто на такое пытанне не адказаў. Не ведаюць гэтага і на кафедры фізічнага выхавання і спорту. А шкада! Трэба старанна сачыць за спартыўным рухам ва універсітэце, вывучаць яго гісторыю. Магчыма, гэта чэмпіянат юбілейны?**

**12 мацнейшых шахматыстаў прымаюць удзел у асабістым першынстве. Сярод іх першаразраднікі выкладчык матэматычнага факультэта А. Наумовіч, студэнт юрыдычнага факультэта Э. Баленда, студэнт IV курса аддзялення журналістыкі Ю. Новікаў. Астатнія ўдзельнікі — вопытныя турнірныя байцы-другаразраднікі. Ужо прайшло тры туры. Паспяхова пачаў турнір Новікаў. Ён атрымаў тры перамогі запар, і цяпер з'яўляецца лідэрам першынства. Не абышлося і без нечаканасцей. Другаразраднік студэнт матэматычнага факультэта Кузнечык атрымаў перамогу над першаразраднікам Балендай. Добрага выніку на старце дабіўся і студэнт філалагічнага факультэта В. Канапліцкі, які ў першым туры згуляў унічыю з Груда (матфак), а ў трэцім туры выйграў у Баленды. Аб напружанасці барацьбы сведчыць вялікая колькасць адкладзеных партый. Уперадзе яшчэ 8 тураў і ўся барацьба за ганаровае званне чэмпіёна універсітэта.**

### ЗА ШАХМАТНАЙ ДОШКАЙ—ВЫКЛАДЧЫКІ

**Спартыўны клуб універсітэта сумесна з мясцкомам БДУ зрабілі добры пачын: даць магчымасць «пазмагацца» за шахматнымі столікамі прафесарска-выкладчыцкаму складу і работнікам адміністрацыйна-гаспадарчай часткі.**

**Сярод іх, аказваецца, нямала не толькі аматараў, але і ўмелых шахматных байцоў. Кожная прафсаюзная група мела права выставіць каманду з трох чалавек. Але філолагі, географы і гісторыкі, нажаль, не скарысталі гэтае права. Барацьба 5 каманд прайшла вельмі цікава і напружана. Да апошняга тура было невядома, хто будзе ўладальнікам кубка мясцкома. Каманда фізічнага факультэта, выйграўшы з лікам 3:0 у каманды адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, стала першым уладальнікам ганаровага прыза. Дарэчы, перамога фізікаў не выклікае здзіўлення. Гонар факультэта абаранялі вопытныя шахматысты кандыдаты (праўда, яшчэ не ў майстры па шахматах) фізіка-матэматычных навук: Станіслаў Антонавіч Пахута, Леанід Вікенцьевіч Валадзько і Леанід Аляксандравіч Барысаглебскі. На другім месцы каманда матэматыкаў, якую узначальвае першаразраднік Наумовіч, на трэцім—каманда адміністрацыйна - гаспадарчай часткі.**

**Н. ЮР'ЕЎ.**



Ва універсітэце працягваюцца спаборніцтвы на здачу нормаў ГПА.

**На здымку:** студэнт I курса В. Шэйнеман страляе з малакалібернай вінтоўкі ва універсітэцкім ціры.

Фота Г. Праваловіча.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. | Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.
АТ 03132. Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2000 экз. Зак. 478.